# СЕКЦИЯ 8
# «СОВРЕМЕННОЕ ВОСТОКОВЕДЕНИЕ: ПРОБЛЕМЫ И ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ»

## МІЖНАРОДНЫ КАНТЭКСТ КАГЕРСКАЙ ВАЙНЫ 1978—1979 гг. ПАМІЖ ТАНЗАНІЯЙ І УГАНДАЙ

**А. А. Валодзькін**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, a.valodzkin@gmail.com*

У артыкуле разгледжана міжнародная сітуацыя, што прывяла да пачатку вайны паміж Угандай і Танзаніяй у кастрычніку 1978 г., а таксама спробы міжнароднага пасярэдніцтва з мэтай урэгулявання гэтага канфлікта. Прааналізавана развіццё Танзаніі, Уганды і Кеніі ў першыя два дзесяцігоддзі пасля набыцця імі незалежнасці ад Вялікабрытаніі і правал першых спроб стварэння Ўсходнеафрыканскай Супольнасці. Адлюстравана роля, якую адыгралі ў складанні канфліктнай сітуацыі асобы палітычных лідэраў Уганды і Танзаніі — І. Аміна і Дж. Ньерэрэ, а таксама той знешнепалітычны курс, які яны праводзілі. Прыведзены меркаванні наконт таго, як гэты ваенны канфлікт упісваўся ў тагачасныя рэаліі халоднай вайны.

***Ключавыя словы:*** Кагерская вайна; Танзанія; Уганда; Кенія; Усходнеафрыканская Супольнасць.

## THE INTERNATIONAL CONTEXT OF THE 1978—1979 WAR OF KAGERA BETWEEN TANZANIA AND UGANDA

**A. A. Valodzkin**

*Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, a.valodzkin@gmail.com*

The article examines the international situation that led to the beginning of the war between Uganda and Tanzania in October 1978, as well as international mediation attempts aimed to resolve this conflict. The development of Tanzania, Uganda and Kenya in the first two decades after their independence from Great Britain and the failure of the first attempts to create the East African Community are analyzed. The role played by political leaders of Uganda and Tanzania — I. Amin and J. Nyerere, as well as the foreign policy course they pursued is revealed. Considerations are given about how this military conflict fit into the realities of the Cold War at the time.

***Keywords:*** War of Kagera; Tanzania; Uganda; Kenya; East African Community.

У першай палове 1960-х гг. былыя брытанскія ўладанні ва Ўсходняй Афрыцы атрымалі незалежнасць і на іх тэрыторыі ўзніклі тры суверэнныя дзяржавы: Кенія, Уганда і Аб'яднаная Рэспубліка Танзанія. Як адзначаюць беларускія даследчыкі А. Чэлядзінскі і С. Лашкевіч, яшчэ з каланіяльных

часоў існавалі ідэі аб'яднання гэтых краін ва ўсходнеафрыканскую інтэграцыйную супольнасць ці нават федэрацыю [1, с. 218—219]. Спачатку гэтыя планы сыходзілі ад брытанскай каланіяльнай адміністрацыі, што імкнулася такім чынам замацаваць шматрасавы характар кіравання ў сваіх былых уладаннях пасля іх пераходу да незалежнасці (захаваць палітычнае прадстаўніцтва ва ўладзе еўрапейскай і азіяцкай меншасцяў, што з'яўляліся эканамічнай элітай ва ўсіх гэтых краінах, але складалі больш-менш істотную частку насельніцтва толькі ў Кеніі). Тады гэтыя планы відавочна выклікалі абурэнне афрыканскай большасці і былі адхіленыя. Але напачатку 1960-х гг., калі прадаставіўшы незалежнасць Танганьіке і Угандзе брытанцы не спяшаліся зрабіць тое самае для Кеніі і Занзібара, ўжо афрыканскія лідэры падхапілі ідэю федэрацыі, каб прымусіць Брытанію канчаткова сысці з Усходняй Афрыкі. Пры гэтым, па словах брытанскага гісторыка П. Кальвакарэссі, толькі нацыянальны лідэр Танганьікі Дж. Ньерэрэ сапраўды верыў у ідэю федэрацыі, у той час, як лідэры Кеніі і Уганды Дж. Keніята і М. Аботэ звярнуліся да яе толькі ў тактычных мэтах дзеля ціску на Лондан [2, с. 234]. І гэта было зразумелым, бо на той час ва ўсіх трох краінах ужо вылучыліся харызматычныя нацыянальныя лідэры і стварэнне федэрацыі відавочна паставіла б перад імі праблему барацьбы за першынства ў гэтым новым утварэнні, асабліва з улікам таго, што Дж. Ньерэрэ і Дж. Кеніята былі прыхільнікамі праводзення прынцыпова рознага ўнутры- і знешнепалітычнага курсу.

Таму пасля атрымання незалежнасці ў снежні 1963 г. Кеніяй, а напачатку 1964 г. — Занзібарам, які праз тры месяцы ўз'яднаўся з Танганьікай у Аб'яднаную Рэспубліку Танзанія, кожная з дзяржаў пайшла сваім шляхам. Кенія, як адзначае П. Кальвакарэссі, пачала будаваць класічны капіталізм — карумпаваны, хаатычны і куды менш справядлівы ў сэнсе размеркавання даходаў сярод насельніцтва, але куды больш спрыяльны для эканамічнага росту чым танзанійскі сацыялізм [2, с. 236]. Пры гэтым быў узяты ўстойлівы курс на захаванне і нарошчванне эканамічных сувязяў з былой метраполіяй і іншымі краінамі Захаду. Нягледзячы на тое, што першы прэзідэнт Кеніі Дж. Кеніята ў маладосці навучаўся ў Савецкім Саюзе, кароткі перыяд супрацоўніцтва з СССР хутка скончыўся, а прасавецкі прэм'ер-міністр А. Адзінга быў абвінавачаны ў падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту і адхілены ад улады. Пасля гэтага Кенія з улікам рэалій халоднай вайны пачала арыентавацца на Захад і ў палітычным плане. Таму не дзіва, што пасля сацыялістычнай рэвалюцыі ў Эфіопіі амерыканскія ваенныя базы былі пераведзены з гэтай краіны менавіта ў Кенію.

Іншы курс абрала Танзанія. Пад уплывам ідэй Дж. Ньерэрэ аб афрыканскім абшчынным сацыялізме, якія ён абагульніў у канцэпцыю «уджумаа», краіна пайшла сацыялістычным шляхам развіцця. Як і ў краінах сацыялістычнага блоку ў Танзаніі была ўсталявана аднапартыйная сістэма, праўда, з асобнай шырокай аўтаноміяй для Занзібара. Аднак, нягледзячы на гэта, краіна так і не стала паўнавартаснай часткай прасавецкага сацыялістычнага блоку, бо Дж. Ньерэрэ катэгарычна

адвяргаў тэзу аб універсальнасці марксіцка-ленінскага шляху пабудовы сацыялізму, як і любы іншы дагматызм ў гэтым пытанні. Ён адстойваў ідэю, што кожная нацыя павінна будаваць свой уласны сацыялізм, які мае карані ў яе культуры, і лічыў, што Танзанія мусіць пераймаць вопыт не толькі камуністычных СССР і КНР, але і заходнееўрапейскіх сацыялдэмакратаў [3, с. 70]. Такім чынам, у супрацьстаянні халоднай вайны пазіцыя Танзаніі заставалася шмат у чым амбівалентнай і яе статус хутчэй варта вызначыць як нейтральны. Куды больш выразным і акрэсленым быў танзанійскі курс у афрыканскай палітыцы. Тут Дж. Ньерэрэ паслядоўна адстойваў прынцыпы афрыканскага адзінства і канчатковай дэкаланізацыі кантыненту. Кіруючыся імі ён аказваў актыўную падтрымку паўстанцам, што змагаліся супраць партугальскай каланіяльнай улады ў Мазамбіку і супраць улады белай меншасці ў Паўднёвай Радэзіі (будучай Зімбабвэ), Паюднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і Намібіі (некаторыя з іх нават мелі свае базы на тэрыторыі Танзаніі). Аднак такая знешняя палітыка выклікала напружанасць у стасунках з суседзямі.

У самай складанай сітуацыі апынулася Уганда. Увесь час брытанскага праўлення ў яе складзе існавала некалькі традыцыйных каралеўстваў, што захаваліся яшчэ з дакаланіяльных часоў. Самым буйным з іх была Буганда, што вылучалася высокім узроўнем сепаратызму. Напрыканцы 1950-х гг бугандыйскія манархісты патрабавалі ад брытанскіх улад асобнай незалежнасці для Буганды з выхадам са складу Уганды. Аднак напярэдадні атрымання Угандай незалежнасці ў 1962 г. лідэр адной з вядучых угандыйскіх партый М. Аботэ заключыў палітычнае пагадненне з каралём Буганды Мутэсай ІІ, па ўмовах якога Мутэса ІІ стаў першым прэзідэнтам Уганды з даволі абмежаванымі паўнамоцтвамі, а сам М. Аботэ — прэм'ер-міністрам і сапраўдным кіраўніком дзяржавы. Але гэты альянс распаўся ўжо ў 1966 г., калі Мутэса ІІ быў пазбаўлены свайго паста і вымушаны пакінуць краіну, а М. Аботэ сканцэнтраваў уладу ў сваіх руках. Ён праводзіў досыць непаслядоўны курс, як ва ўнутранай, так і ў знешняй палітыцы — напрыклад, імкнуўся падтрымліваць добрыя стасункі з былой метраполіяй, але ў 1970 г. абвясціў аднапартыйнае праўленне і курс на пабудову камунізму. Пры гэтым М. Аботэ падтрымліваў вельмі добрыя сяброўскія адносіны з кіраўніком Танзаніі Дж. Ньерэрэ (гэты фактар потым адыграе важную ролю ў разгортванні ўгандыйска-танзанійскага канфлікту).

Правалы ў эканоміцы, якія наклаліся на рэзкае падзенне коштаў на асноўныя пазіцыі ўгандыйскага экспарту на сусветным рынку спрыялі росту незадаволенасці праўленнем М. Аботэ ў краіне. І ў выніку падчас аднаго з замежных візітаў ён быў адхілены ад улады групай ваенных начале з І. Амінам, які абвясціў сябе новым кіраўніком Уганды. Рэжым І. Аміна значна пераўзышоў свайго папярэдніка як па жорсткасці праўлення, гэтак і па яго неэфектыўнасці. Ён лічыцца адным з самых крывавых і агрэсіўных рэжымаў Афрыкі другой паловы ХХ ст. У знешняй палітыцы Амін спачатку абвясціў сябе «лепшым сябрам Ізраіля», але не атрымаўшы ад яго

той падтрымкі, на якую разлічваў, хутка пераарыентаваўся на арабскія краіны, найперш, на кіраўніка Лівіі М. Каддафі.

Нягледзячы на ўсе гэтыя разыходжанні ідэя рэгіянальнай інтэграцыі яшчэ пэўны час знаходзіла падтрымку ў лідэраў трох краін, бо яна грунтавалася на шчыльных эканамічных сувязях — яшчэ з каланіяльных часоў паштовая і транспартная інфраструктура Танзаніі, Кеніі і Уганды развівалася як адзіная сістэма пад агульным кіраваннем. Таму ў 1967 г. лідэры гэтых трох краін абвясцілі аб стварэнні новай інтэграцыйнай структуры — Усходнеафрыканскай Супольнасці. Яе першапачатковай мэтай было абвешчана стварэнне валютнага саюзу, а далей і агульнага рынку па ўзоры ЕС. Але абвешчаныя мэты так і засталіся толькі на паперы [4].

А з пачатку 1970-х гг. стасункі паміж гэтымі дзяржавамі пачалі пагаршацца, што ў выніку прывяло да распаду Усходнеафрыканскай Супольнасці ў 1977 г. Адносіны Кеніі і Танзаніі абвастрыліся з-за маёмасных спрэчак і канфліктаў паміж памежнымі плямёнамі. А адносіны Танзаніі і Уганды сапсаваліся пасля перавароту І. Аміна, калі Дж. Ньерэрэ адмовіўся прызнаваць звяржэнне свайго сябра М. Аботэ і ўсталяванне новага ўгандыйскага рэжыму. Пасля гэтага шмат палітычных дысідэнтаў з Уганды, што выступалі супраць улады І. Аміна (у тым ліку і сам Аботэ), знайшлі прытулак на тэрыторыі Танзаніі — пераважна ў памежнай правінцыі Кагера. Гэта выклікала абурэнне Аміна і патрабаванне каб танзанійскі бок адмовіўся ад іх падтрымкі з пагрозай скарыстаць ваенную сілу ў адваротным выпадку. Да таго ж Амін называў існуючую лінію мяжы паміж Угандай і Танзаніяй несправядлівай і патрабаваў яе перагляду на карысць Уганды.

Улады Танзаніі, што не прызнавалі рэжым І. Аміна, ігнаравалі гэтыя патрабаванні і не ўспрымалі ягоныя пагрозы ўсур'ёз. У 1970-я гг. Танзанія мела досыць напружаныя стасункі з шэрагам суседзяў — Заірам, Кеніяй, Малаві, — і адносіны з Угандай выглядалі на гэтым фоне не самымі горшымі. Таму танзанійскае кіраўніцтва да апошняга не верыла ў магчымасць угандыйскага ваеннага ўварвання і аказалася цалкам да яго не падрыхтаваным, што дало значна меншай па колькасці і горш узброенай арміі Уганды пэўныя перавагі ў самым пачатку вайны. Аднак у мэты гэтай працы не ўваходзіць апісанне ходу баявых дзеянняў, што ўрэшце прывялі да поўнай перамогі Танзаніі і звяржэння рэжыму І. Аміна. Нас куды больш цікавіць міжнародная рэакцыя на гэтую вайну і яе ацэнкі.

З улікам сваёй паафрыканскай ідэалогіі Дж. Ньерэрэ ў першую чаргу звярнуўся па падтрымку да Арганізацыі афрыканскага адзінства. Але яна так і не здолела выпрацаваць агульнае рашэнне з-за таго, што шэраг краін Заходняй Афрыкі занялі нейтральную пазіцыю і адмовіліся асудзіць угандыйскае ўварванне. Непасрэдны ўдзел у канфлікце прынялі толькі Мазамбік (на баку Танзаніі) і Лівія (на баку Уганды). Новы прэзідэнт Кеніі Д. А. Мoі прапанаваў бакам сваё пасярэдніцтва. Аднак у той жа час ён праігнараваў заклік кіраўніка Танзаніі спыніць пастаўкі паліва Угандзе і запэўніў прадстаўніка І. Аміна, што Кенія забяспечыць для Уганды бес-

перапынны транзіт і будзе супрацьдзейнічаць умяшанню Дж. Ньерэрэ ва ўнутраныя справы Уганды. Такім чынам кенійскі нейтралітэт выглядаў вельмі сумнеўна [5, с. 159—160].

Палітычную падтрымку Танзаніі аказалі найперш яе саюзнікі з кааліцыі па барацьбе супраць апартэіду з ліку паўднёваафрыканскіх краін, а таксама Эфіопія. З гэтай нагоды некаторыя афрыканскія і еўрапейскія палітыкі выказвалі меркаванне, што напад Уганды быў спецыяльна справакаваны пэўнымі палітычнымі коламі на Захадзе, каб падарваць магчымасці Танзаніі па падтрымцы барацьбы з апартэідам на Поўдні Афрыкі і адцягнуць міжнародную ўвагу ад гэтай праблемы [5, с. 161].

Часам сустракаецца і іншае меркаванне, што Угандыйска-танзанійскую вайну можна ўпісаць у кантэкст халоднай вайны як унутраны канфлікт сацыялістычнага лагеру, абумоўлены абвастрэннем барацьбы за лідэрства ў ім у 1970-я гг. паміж СССР і Кітаем. У гэтым сэнсе Кагерскую вайну ставяць у адзін шэраг з блізкімі па часе войнамі паміж В'етнамам і Кампучэяй ці паміж Эфіопіяй і Самалі, у якіх «сутыкнулася савецкая і кітайская зброя». У падтрымку такой версіі выказваюцца аргументы, што КНР ужо ў тыя часы мела значныя эканамічныя інтарэсы ў Танзаніі [2, с. 347], а СССР ускосна падтрымліваў рэжым І. Аміна праз Лівію. Аднак за мінулыя з часоў гэтага канфлікту больш як 40 гадоў пакуль так і не было знойдзена доказаў прамой падтрымкі СССР і КНР супрацьлеглых бакоў Кагерскай вайны. Таму, калі яе і можна ставіць у адзін шэраг са згаданымі войнамі В'етнама і Кампучэі ці Эфіопіі і Самалі, то хутчэй у тым, што, нягледзячы на сусветнае біпалярнае супрацьстаянне, першасную ролю ў іх адыгрывалі менавіта мясцовыя фактары, а не мэтанакіраваная палітыка вялікіх дзяржаў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Лашкевич, С. А. Африка в современном мире / С. А. Лашкевич, А. А. Челядинский. — Минск: Право и экономика, 2010. — 321 с.
2. Мировая политика после 1945 г.: в 2 кн. Кн. 2 / П. Кальвокоресси. — М.: Междунар. отношения, 2000. — 464 с.
3. Камалова, К. Р. Роль политической идеологии в международных отношениях на примере советско-танзанийского сотрудничества / К. Р. Камалова // Сборник статей, подготовленных в рамках Академии НСО-2023, 15 июня — 31 дек. 2023 г., Москва / под ред. Аськова Я. А. [и др]. — М., 2023. — С. 67—72.
4. Долгов, К. Д. Причины неудачи региональной интеграции в Восточной Африке в 1970-х годах XX столетия / К. Д. Долгов // Конфликтология / Nota bene. — 2017. — № 3. — С. 50—66.
5. Roberts, G. The Uganda-Tanzania War, the fall of Idi Amin, and the failure of African diplomacy, 1978—1979 / G. Roberts // Politics and Violence in Eastern Africa: the Struggles of Emerging States; ed. by D. M. Anderson, Ø. H Rolandsen. — Abingon, 2017. — P. 154—171.